# Час духоўнасці "З мінулым у будучыню".
# 22.08.2023г.

Без глыбокага духоўнага і маральнага пачуцця чалавек не можа мець ні кахання, ні гонару – нічога, чым чалавек ёсць чалавек.

В.Бялінскі

Наведвальнікі клуба "Бяседа", які працуе ў аддзяленні дзеннага знаходжання грамадзян сталага ўзросту дзяржаўнай установы "Тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Ашмянскага раёна" сталі ўдзельнікамі адкрыцця выставачнага праекта "Пад святой абаронай Спаса", прымеркаванай да 140-годдзя будаўніцтва Свята-Васкрасенскага храма ў Ашмянах. Мерапрыемства адбылося ў Ашмянскім краязнаўчым музеі імя Ф.К.Багушэвіча. Вядучая Анастасія Навіцкая, дырэктар музея, пазнаеміла прысутных з гісторыяй будаўніцтва Свята-Васкрасенскага храма. Протаіерэй пробашч Георгій Муха апавядаў пра духоўную культуру кожнага з нас, заклікаў быць крыху дабрэйшымі адзін да аднаго, падзяліўся планамі па правядзенню работ па добраўпарадкаванню царквы.

У выкананні выкладчыка Ашмянскай музычнай школы Кацярыны Мандрык для ўдзельнікаў выставы прагучала меладычная песня "Аве Марыя".

Мерапрыемства было цікавым, запамінальным, духоўна насычаным. З вялікай увагай прысутныя знаёміліся з экспанатамі, уважліва разглядвалі фотаздымкі храма мінулых гадоў, дзяліліся ўражаннем аб выставе.

Прымаючы ўдзел у такіх мерапрыемствах заўсёды разумееш, што не знешнасць трэба ўпрыгожваць, але быць прыгожым у духоўных пачынаннях.



